ГЭТА МЫ

# СВАЯКАМ НЕ ПАТРЭБНЫЯ?

**ЖЫЛІ ў Мінску маці з сынам. Жанчына памерла. Сын пазваніў у службу перавозак сталічнага спецкамбіната, каб яе забралі. Прыехалі спецыялісты, адвезлі маці ў крэматорый і папярэдзілі сына, што яму трэба набыць труну і аформіць дакументы на крэмацыю і пахаванне. Прайшло тры дні, а сын так і не з'явіўся. Пазванілі яму з крэматорыя, пытаюць, дзе ён дзеўся, а той ім сустрэчнае пытанне: «А хіба вы яе яшчэ не крэміравалі?».**

Сын палічыў, што калі маці забраў спецкамбінат, то яго работнікі павінны самі ўсё зрабіць. Грошы ж, што дзяржава выдаткавала на пахаванне, ён даўно прапіў... Аднак маці, напэўна, прадбачыла, як можа павярнуцца справа, таму грошы з пенсіі збірала ды пад матрац хавала. Добра, што сын іх адразу не знайшоў, а толькі тады, калі зноў прыехалі супрацоўнікі спецкамбіната. За тыя матчыны сродкі ён і труну набыў, і рытуальныя прыналежнасці, і дакументы аформіў. Маці крэміравалі, а урна з яе прахам... так і стаіць другі год у крэматорыі, бо сыну яна не патрэбна. Забраць яе і пахаваць па-людску яго ўжо ніякім законам не прымусіш, колькі ні звані. А як пройдуць тры гады, урну пахаваюць у агульнай магіле разам з іншымі крэміраванымі, якія не патрэбны сваякам.

## Забралі і... забыліся

Летась спецыялізаваны камбінат камунальна-бытавога абслугоўвання такім чынам пахаваў на Заходніх могілках 62 урны з прахам тых, каго сваякі пагадзіліся крэміраваць, але за тры гады так і не забралі з крэматорыя. Цяпер над агульнай магілай змяшчаецца таблічка, дзе сказана, што тут захаваны незапатрабаваныя урны і ўказана іх колькасць без пераліку імёнаў. Спіс тых, хто менавіта захаваны, застаецца ў арганізацыі.

Не забіраюць урны з прахам з розных прычын. У кагосьці сваякі алкаголікі, або яны не маюць магчымасцяў і сродкаў на пахаванне, або пераехалі за мяжу. А ёсць і такія, хто жылі як кот з сабакам, і для іх галоўнае, што сваяка крэміравалі, а далей — хоць трава не расці.




— Летась перад пахаваннем урнаў, якія захоўваліся ў нас ужо тры гады, мы на сайце вывесілі абвестку, што збіраемся рабіць, і абзваньвалі сваякоў, чые каардынаты мелі, каб папярэдзіць, — заўважае **Сяргей ТУР, намеснік дырэктара спецыялізаванага камбіната камунальна-бытавога абслугоўвання.** — З 67 урнаў толькі пяцёра забралі сваіх. Астатнія адправіліся на спачын у агульную магілу.

Рашэнне аб крэмацыі прымаюць сваякі памерлага або арганізацыя, якая бярэ на сябе абавязкі па пахаванні, калі ў нябожчыка нікога не было. Здараецца, сам чалавек пакідае распараджэнне пра такое сваё жаданне. Урну з прахам можна пахаваць у зямлю на магіле ці паставіць у калумбарную сценку. Крэмацыя, дарэчы, абыходзіцца крыху танней, чым традыцыйнае пахаванне.

— Сваякі атрымліваюць на пахаванне каля 800 рублёў. Калі набываць самыя танныя прыналежнасці да пахавання, з гэтых грошай застаецца каля 300 рублёў. Так звычайна робяць тыя, хто любіць выпіць: самае таннае купяць, сваяка крэміруюць, а рэшту прап'юць. А пра урну потым не хочуць нічога ведаць, ім ужо памерлы не патрэбны, — заўважае спецыяліст.

## Безыменныя...

Амаль на кожных могілках ёсць участкі, дзе ляжаць тыя, хто пры жыцці не меў ні жылля, ні родных. На іх пагостах драўляныя тумбы ўстаноўленага ўзору або металічныя крыжы з нумарамі. Здараецца, сустракаецца і імя, калі супрацоўнікам спецкамбіната ўдалося яго даведацца. Гэтыя людзі сталі незапатрабаванымі пасля смерці, і іх пахавалі за кошт дзяржавы на агульных могілках.

Нейкага тэрміну для захоўвання безыменных памерлых не існуе. Калі ў моргу збіраецца некалькі такіх асоб, іх перадаюць у спецкамбінат.

— Апошнія тры-чатыры гады такім памерлым перад пахаваннем абавязкова робяць аналіз ДНК, каб, калі знойдуцца сваякі, не ўзнікала блытаніны. Здараецца, што родныя пахаванага з'яўляюцца і праз тры месяцы, і праз паўгода ці год, — кажа Сяргей Тур.

Менавіта таму, што сваякі ў многіх праз час усё ж знаходзяцца, асоб без пэўнага месца жыхарства не крэміруюць, — каб родныя маглі добраўпарадкаваць магілу. Некаторыя нават просяць аб эксгумацыі, каб перавезці цела на іншыя могілкі, бліжэй да продкаў. Аднак з агульнай магілы ні урны, ні трупы не эксгумуюцца.

Супрацоўнікі спецкамбіната спадзяюцца з часам атрымаць дазвол на крэмацыю такіх асоб. Для захавання урны з прахам трэба ўсё ж не так шмат месца, а зямлі для пахаванняў застаецца ўсё менш.

**Ірына СІДАРОК.**

ПЫТАЛЬНІК

# ПАЛЯЎНІЧЫ Ў ЛОДЦЫ

## Ці магчыма такое падчас нерасту?

***Былі ў сваякоў ва Ушацкім раёне. Сустрэлі знаёмага, той паляўнічы. Ён сказаў, што збіраецца на птушку, для палявання рыхтуе лодку. Але ж зараз дзейнічае веснавая забарона на лоўлю рыбы, падчас якой лодкамі карыстацца забаронена. Ці не так?***

**Ігар ПАЛЯНСКІ,** *г. Мінск.*

Сапраўды, у перыяд нераставай забароны рыбакам і іншым грамадзянам забаронена выкарыстоўваць у рыбалоўных угоддзях маламерныя судны. Аднак для паляўнічых у веснавым сезоне зроблены выключэнні. Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, паляўнічыя могуць карыстацца маламернымі суднамі без рухавікоў, толькі для пэўных мэт: устаноўкі і (або) зняцця падсадных качак, профіляў, чучал і пад'ёму здабытай дзічыны. Гэтая норма замацавана як у Правілах вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства (падпункт 109.6), так і ў Правілах вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання (пункт 115).

Выкарыстанне паляўнічымі маламерных суднаў у іншых мэтах — для транспарціроўкі да месца палявання або назад, пераправы цераз водныя аб'екты, у якасці скрадка (шляхам абсталявання апошняга непасрэдна на маламерным судне), для дабору падранкаў і іншае — у веснавым сезоне палявання не дапускаецца! Гэта з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем, за якое прадугледжана адказнасць.

Знаходжанне ў маламерным судне паляўнічых з расчахлёнай і (або) зараджанай паляўнічай зброяй з'яўляецца паляваннем з пад'езду, ажыццяўленне якога ў веснавым сезоне палявання забаронена.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**«Годовой отчет эмитента ценных бумаг»**
**Полн. наименование: открытое акционерное общество «МАПИД»**
**Адрес: 220036, г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205**
**Полное Ф.И.О. руководителя: Милошевский Николай Викторович**
**Полное Ф.И.О. главного бухгалтера: Цыбульская Елена Владимировна**
**Основные виды деятельности: строительство**
**Единица измерения: тыс. руб.**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2017 года**

| АКТИВ | Код строки | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| **I. Долгосрочные активы** | | |
| Основные средства | 110 | 101 276 |
| Нематериальные активы | 120 | 278 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 15 488 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 666 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 6 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 540 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **118 254** |
| **II. Краткосрочные активы** | | |
| Запасы | 210 | 51 070 |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 1 178 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 575 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 59 693 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 7 857 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 242 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **120 615** |
| **БАЛАНС** | **300** | **238 869** |
| **Собственный капитал и обязательства** | | |
| **III. Собственный капитал** | | |
| Уставный капитал | 410 | 68 462 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - |
| Собственные акции(доли в уставном капитале) | 430 | - |
| Резервный капитал | 440 | 6 190 |
| Добавочный капитал | 450 | 45 036 |
| Нераспределенная прибыль(непокрытый убыток) | 460 | 55 151 |
| Чистая прибыль(убыток)отчетного периода | 470 | - |
| Целевое финансирование | 480 | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **174 839** |
| **IV. Долгосрочные обязательства** | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 1 023 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 16 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | 6 694 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **7 733** |
| **V. Краткосрочные обязательства** | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 5 167 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 460 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 46 619 |
| Обязательства,предназначенные для реализации | 640 | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 3 752 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | 298 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | 1 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **56 297** |
| **БАЛАНС** | **700** | **238 869** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**с 1 января 2017 г. по 31 декабря 2017 г.**

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 290 725 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 248 081 |
| **Валовая прибыль** | **030** | **42 644** |
| Управленческие расходы | 040 | 7 134 |
| Расходы на реализацию | 050 | 842 |
| **Прибыль(убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | **060** | **34 668** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 13 766 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 23 873 |
| Прибыль по текущей деятельности | 090 | 24 561 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 5 079 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 5 963 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 505 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 818 |
| **Прибыль(убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности** | **140** | **-1 197** |
| Прибыль до налогообложения | 150 | 23 364 |
| Налог на прибыль | 160 | 6 141 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли | 190 | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли | 200 | 20 |
| **Чистая прибыль** | **210** | **17 203** |
| Количество акционеров, всего | чел. | 7 119 |
| в том числе: юридических лиц | чел. | 5 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | чел. | нет |
| в том числе: физических лиц | чел. | 7 124 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | чел. | нет |
| Доля государства в уставном фонде (коммунальная) | % | 93,3572 |
| Начислено на выплату дивидендов за отчетный период | тыс. руб. | 5 238,19 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,4743 |
| Обеспеченность акций имуществом Общества | руб | 15,83 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | нет |
| Среднесписочная численность работающих | чел. | 5 882 |
| Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год | 29 марта 2018 года | |
| Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг | общее строительство зданий | |
| Сведения о применении эмитентом правил корпоротивного поведения | применяется | |

Генеральный директор ОАО «МАПИД» Н. В. Милошевский

Главный бухгалтер ОАО «МАПИД» Е. В. Цыбульская

**Аудиторское мнение ООО «Белросаудит»**

По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «МАПИД» на 31.12.2017 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на эту дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Уважаемые акционеры!**

Общим собранием акционеров ОАО «МАПИД» от 29 марта 2018 года установлен следующий порядок и сроки выплаты дивидендов:

– на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финотдела администрации Фрунзенского района;

– работникам юридическим лицам – путем перечисления на расчетные счета – с 01.06.2018 до 30.06.2018;

– физическим лицам, не работникам Общества – путем перечисления через депозитарий «Лидеринвест» с последующей выплатой; по заявлению акционера – почтовым переводом – с 01.06.2018 до 30.06.2018.

– физическим лицам, не работникам Общества,имеющим право на стандартные вычеты по подоходному налогу – по заявлению акционера путем перечисления на электронные карточки.

установленный размер дивидендов на одну акцию за II полугодие 2017 года составляет – 0,2563 рубля.

Депозитарий ЗАО «Лидеринвест» располагается по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, д. 41, оф. 512. При обращении в депозитарий, при себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Администрация.

УНП 100008115